ВЕСЦІ
НАЦЫЯНАЛЬНАЙ АКАДЭМІІ НАВУК БЕЛАРУСІ

СЕРЫЯ ГУМАНІТАРНЫХ НАВУК 2011 № 3

ИЗВЕСТИЯ
НАЦИОНАЛЬНОЙ АКАДЕМИИ НАУК БЕЛАРУСИ

СЕРИЯ ГУМАНИТАРНЫХ НАУК 2011 № 3

ЗАСНАВАЛЬНІК – НАЦЫЯНАЛЬНАЯ АКАДЭМІЯ НАВУК БЕЛАРУСІ

Часопіс выдаецца са студзеня 1956 г.

Выходзіць чатыры разы ў год

ЗМЕСТ

Каваленя А. А., Ляўковіч В. І. Гуманітарная навука: погляд у будучыню (да 75-годдзя з дня заснавання Аддзялення гуманітарных навук і мастацтваў Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі) 4

ФІЛАСОФІЯ І САЦЫЯЛОГІЯ

Левяш И. Я. Коммуникативная семантика геокультуральных концептов триединой Европы 20

Назарова Д. В. Влияние СМИ на формирование общественных настроений (на примере отношения населения к ядерной энергетике) 28

ПРАВА

Манкевіч І. П. Тэарэтыка-прававыя аспекты забеспячэння харчовай бяспекі Рэспублікі Беларусь 36

Ананіч С. М. Пытанні фарміравання зместу шлюбнага дагавора 45

ЭКАНОМІКА

Літвінюк А. І. Стратэгічныя напрамкі і мадэлі развіцця трансгранічнага супрацоўніцтва Рэспублікі Беларусь і Еўрапейскага саюза 53

Іванова А. М. Арганізацыйна-аналітычныя падыходы да правядзення фарсайтных даследаванняў у рэгіёнах Беларусі 60

УДК 94(476).083

П. А. ТРУБЧЫК

НАЦЫЯНАЛЬНАЕ ПЫТАННЕ Ў ПАЛІТЫЧНЫМ ЖЫЦЦІ БЕЛАРУСІ Ў 1907–1912 гг.

Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка

(Паступіў у рэдакцыю 06.07.2010)

Падзеі першай буржуазнай рэвалюцыі прывялі да значных змен у грамадска-палітычным становішчы Расійскай імперыі, у тым ліку і Заходняга краю. 3 чэрвеня 1907 г. урадам быў апублікаваны Маніфест аб роспуску II Дзяржаўнай думы і змяненні «Палажэння аб выбарах». Указ пра выбары парушаў заканадаўства, а іменна Маніфест ад 17 кастрычніка 1905 г. і Асноўныя законы Расійскай імперыі (1906 г.), якія забаранялі змяненне сістэмы выбараў у Дзяржаўную думу без згоды думскіх дэпутатаў. Такім чынам, царызм здзейсніў своеасаблівы дзяржаўны пераварот, які азначаў паражэнне рэвалюцыі 1905–1907 гг. і часовую перамогу сіл контррэвалюцыі.

Найбольш поўна нацыянальную праблему ў заходніх губернях і спосабы яе вырашэння можна ўявіць на аснове матэрыялаў дзейнасці III Дзяржаўнай думы, якая, як вядома, у адрозненне ад 1-га і 2-га скліканняў праіснавала ўвесь адведзены ёй законам тэрмін – з 1907 па 1912 г. Нацыянальная праблематыка трапляла ў поле зроку дэпутатаў не толькі пры непасрэдным звароце да становішча спраў у тым ці іншым этнакультурным рэгіёне, але і ў сувязі з разглядам самых розных пытанняў – самакіравання, адукацыі і культуры, аграрнай праблемы.

Адлюстраваннем складаных і супярэчлівых працэсаў этнаканфесійных зносін таксама, з'яўляўся перыядычны друк. Газета «Наша ніва», цэнтральны орган беларускага нацыянальнага руху, ужо ў першым нумары паставіла нацыянальнае пытанне на першы план і вызначыла галоўную мэту: «каб усе беларусы, якія не ведаюць, хто яны ёсць, – зразумелі, што яны беларусы і людзі» [10].

У беларускай гістарыяграфіі розныя аспекты нацыянальнай праблематыкі трэцячэрвеньскага перыяду разглядаюцца ў манаграфіях М. М. Забаўскага [5], У. Е. Казлякова [6], А. Ф. Смаленчука [29]. З пункту гледжання газеты «Наша ніва» пытанне этнаканфесійных зносін асвятляе А. У. Унучак [31]. Аднак, тым не менш, комплекснага ўсебаковага даследавання нацыянальнага пытання азначанага перыяду няма.

Задачай артыкула з'яўляецца даследаванне на прыкладзе заходніх губерняў пазіцый палітычных партый і груп па нацыянальным пытанні, асаблівасцей дзейнасці III Дзяржаўнай думы ў сферы нацыянальнай палітыкі, матэрыялаў перыядычнага друку.

Вялікае значэнне ў развіцці міжнацыянальных адносін надавалася прадстаўніцтву ў органах мясцовага самакіравання. Дамінаванне прадстаўнікоў асобных этнасаў сярод меўшых неабходны, перш за ўсё маёмасны, цэнз стымулявала імкненне адміністрацыі, органаў улады і шэрагу палітычных партый змяніць парадак фарміравання мясцовых органаў улады.

Органы мясцовага самакіравання былі створаны яшчэ падчас рэформы 60-х гадоў XIX ст. Да канца 70-х гг. XIX ст. земскія ўстановы былі створаны ў 34 губернях Расійскай імперыі. На Беларусь і некаторыя іншыя нацыянальныя раёны палажэнне аб земстве не распаўсюджвалася. Гэта было выклікана тым, што ў заходніх губернях значна было пашырана польскае землеўладанне. У 1865 г. у Гродзенскай, Віленскай, Мінскай і Віцебскай губернях 87,6% усіх землеўладальнікаў мелі польскае паходжанне. Яны валодалі 87,2% маёнткаў і 80,4% уладальніцкай зямлі [24, с. 16]. Пакладзены ў аснову выбарчай сістэмы маёмасна-саслоўны пачатак забяспечваў бы ў земствах гэтых губерняў перавагу польскіх памешчыкаў, чаго царскі ўрад дапусціць не мог.

Пасля трэцячэрвеньскага дзяржаўнага перавароту адным з галоўных сродкаў брацьбы з рэвалюцыйным рухам у заходніх губернях царызм выбраў шавіністычную палітыку, накіраваную ў заходніх губернях супраць палякаў і яўрэяў. Такую ж пазіцыю займалі манархічныя партыі і правы друк, якія патрабавалі ўзмацнення барацьбы з «сепаратызмам» у Заходнім краі. Газета «Белорусская жизнь» пісала: «Урад павінен пабудаваць сістэму земскіх выбараў у краі на больш шырокіх пачатках, з прыцягненнем рускага элемента. Няхай тады земствы будуць недастаткова культурнымі ці нават зусім не культурнымі, але яны будуць рускімі» [1]. На старонках манархічных выданняў знаходзілі адлюстраванне думскія дэбаты аб увядзенні земстваў. У газеце «Окраины России» ў артыкуле «Заходняя Русь і галасаванне ў Дзяржаўнай думе» адзначалася, што «палякі і іншародцы штучна выкарыстоўваюць любыя супярэчнасці ў Думе для распаўсюджвання сярод рускага насельніцтва сумненняў і змяншэння веры ў адзінства рускага народа. Вось ужо, – пісала далей газета, – падсоўваюцца вучэнні аб «беларусізме» і «украінстве», аб трох рускіх народнасцях. Іх можна стварыць яшчэ некалькі, а моў увогуле колькі хочаце» [17].

Тэарэтычна абгрунтоўвала запатрабаванасць самакіравання ў Беларусі газета «Наша ніва». Гэтаму пытанню яна прысвяціла вялікую колькасць публікацый, дзе адзначалася, што прыкметай «культурных» краін з'яўляецца шырокае мясцовае самакіраванне, таму што людзі на месцах лепш «ведаюць свае патрэбы, чым гэта відаць з цэнтра» [31,с. 102].

У маі 1908 г. пры абмеркаванні бюджэту Міністэрства ўнутраных спраў па прапанове правых і акцябрыстаў III Дума прыняла прашэнне ўрада ўнесці законапраект аб земстве ў 9 заходніх губернях, «пры ўмовах уліку справядлівых інтарэсаў рускага насельніцтва краю» [3, стб. 733].

Урад, аднак, зацягваў вырашэнне гэтага пытання. Толькі праз год, у маі 1909 г., П. А. Сталыпін заявіў: «Цяпер ужо зусім высветлілася немагчымасць чакаць увядзення ў заходніх губернях Палажэння аб земскіх установах у бліжэйшым будучым, паколькі пытанне гэта павінна быць па неабходнасці пастаўлена ў сувязі з агульнай земскай рэформай у Расіі, час якой у сувязі са складанасцю яе цяжка вызначыць у гэты момант, хоць бы прыблізна» [28]. Аднак ужо ў студзені 1910 г. урадам быў унесены ў Дзяржаўную думу законапраект аб увядзенні земства ў шасці заходніх губернях.

Спачатку прадугледжвалася ўвядзенне земстваў ва ўсіх дзевяці заходніх губернях. Аднак паколькі ў Віленскай, Гродзенскай і Ковенскай губернях абсалютную большасць буйных землеўладальнікаў складалі палякі, вырашылі спачатку ўвесці земствы ў Віцебскай, Мінскай, Магілёўскай, Кіеўскай, Валынскай і Падольскай губернях. Быў падрыхтаваны законапраект МУС на чале з П. А. Сталыпіным «Аб прымяненні Палажэння аб земскіх установах 12 чэрвеня 1890 г. да Віцебскай, Мінскай, Магілёўскай, Кіеўскай, Валынскай і Падольскай губерняў». Законапраект грунтаваўся на «Палажэнні 1890 г.», але ў яго, у адпаведнасці з нацыянальнымі планамі П. А. Сталыпіна, быў унесены рад істотных змяненняў. Замест саслоўных курый (сялянскай і памешчыцкай) уводзіліся курыі нацыянальныя – «руская» і «польская». У «рускую» курыю ўключалася праваслаўнае беларускае насельніцтва, а ў «польскую» – каталіцкае. Для таго каб забяспечыць перавагу ў земстве за рускімі памешчыкамі, памяншалася колькасць гласных ад палякаў [13, с. 82].

Урад таксама не адмаўляўся і ад апоры на польскіх землеўладальнікаў, забяспечваючы ім даволі высокае прадстаўніцтва ў земствах, а ў «польскай» курыі – поўную перавагу над сялянамі.

Для ўзмацнення ўплыву праваслаўнага духавенства праект прадугледжваў, што яго прадстаўнікі атрымаюць не адно месца ў земскіх выбарчых сходах (як па агульным Палажэнні 1890 г.), а тры – у павятовых і чатыры – у губернскіх. У земскіх сходах у заходніх губернях атрымаў права прымаць удзел таксама прадстаўнік Сялянскага пазямельнага банка. Кіраўніцтва выканаўчых органаў земстваў – старшыні ўпраў, старшыні камісій і іншыя павінны былі належаць да асоб «рускага паходжання» [9, с. 97–98].

Дзвюма галоўнымі праблемамі, якія прадвызначылі палітычную барацьбу па вынесеным праекце, сталі нацыянальныя курыі і зніжэнне выбарчага цэнзу.

Кіраўнік Польска-літоўска-беларускай групы Ю. С. Монтвіл яшчэ ў сваім выступленні 29 красавіка 1908 г. ахарактарызаваў становішча «Паўночна-Заходняга краю» як «невыноснае». Ён падкрэсліў, што ў краі фактычна не дзейнічаюць агульнадзяржаўныя законы. Выключнае

заканадаўства моцна абмяжоўвае правы карэннага насельніцтва. На думку віленскага дэпутата, толькі чыноўнікі з'яўляюцца паўнапраўнымі жыхарамі Беларусі і Літвы. Адначасова Ю. С. Монтвіл звярнуў увагу на тое, што «ў нас 75%, а па некаторых ведамствах нават 100% чыноўнікаў складаюцца з асоб, якія часова знаходзяцца ў краі». Дэпутат выказаўся за адмену абмежавальных законаў, за ўвядзенне поўнай грамадзянскай роўнасці, шырокага самакіравання і земстваў [29, с. 219].

Неабходнасць увядзення выбарнага земства ў дзевяці губернях даказваў дэпутат ад Віленскай губерні Г. І. Свянціцкі, які заявіў, што земствы павінны грунтавацца на прынцыпе роўнасці [29, с. 219].

Дэпутат ад Мінскай губерні, член правай фракцыі, рэктар духоўнай семінарыі А. Д. Юрашкевіч бачыў небяспеку ў тым, што ўрадавы праект улічваў палякаў, якія размаўляюць па-польску, а беларусы-каталікі, якія карыстаюцца беларускай, рускай або маларасійскай мовамі, на яго думку, будуць далучаны да рускай курыі, але будуць галасаваць так, як ім скажуць польскія памешчыкі. Павятовы лідар дваранства з Магілёўскай губерні, член Рускай нацыянальнай фракцыі М. М. Ладамірскі, таксама баяўся таго, што ў земствы трапяць «падстаўныя асобы», якія будуць абараняць інтарэсы польскіх або яўрэйскіх уласнікаў [3, стб. 869, 871]. Тым не менш, абодва дэпутаты выступалі за ўвядзенне земства, бачачы ў ім сродак эканамічнага пад'ёму.

Фактычна праграмным стала выступленне ў Думе П. А. Сталыпіна па праблеме ўвядзення земства ў заходніх губернях. Ён сцвярджаў, што законапраект «пакладзе канец далейшай племянной барацьбе», а «Заходні край ёсць і будзе рускім назаўсёды» [19, с. 430].

Палітычныя партыі і групы выказалі рознае стаўленне да законапраекта. Асаблівую крытыку выклікала палажэнне аб нацыянальных курыях. Дэпутаты ад Польскага кола не былі згодны з абмежавальнымі мерамі для палякаў, а Руская нацыянальная фракцыя прызнавала гэтыя меры недастатковымі [3, стб. 762].

Палітычная барацьба ў Думе знаходзіла сваё адлюстраванне на старонках газет. «Минское слово» ў артыкуле «Трэйці элемент у земстве» заклікала асцерагацца «захопу палякамі земскіх пасад». «Трэйці элемент у земстве, – тлумачыла газета, – гэта тыя, хто непасрэдна кантакціруе з мясцовым насельніцтвам – з сялянствам і аказвае ўплыў на яго» [8]. Газета «Окраины России», наадварот адзначала, што «ўвядзенне земскага самакіравання ў заходніх губернях выклікала ўздым рускай самасвядомасці, што ў нас назіраецца ў большасці выпадкаў толькі ў тыя моманты, калі асабліва праяўляецца моцны ціск іншародцаў на рускую народнасць» [18].

Лідар Польска-літоўска-беларускай групы Ю. С. Монтвіл лічыў, што ўвядзенне нацыянальных курый выстаўляла на пярэдні план не эканамічнае пытанне, а палітычнае і нацыянальнае. Гэта можа прывесці да таго, што ў земствы і па «рускай», і па «польскай» курыям будуць абраны найбольш «крайнія нацыянальныя элементы», а не спецыялісты па земскай гаспадарцы [29, с. 218–219].

Член Краёвай партыі Літвы і Беларусі С. А. Ваньковіч заявіў, што прыняцце законапраекта прывядзе да «земскага самаўпраўства», а не да самакіравання. У прапанове ўрада, на яго думку, выразна чытаецца лозунг велікарускіх нацыяналістаў «Расія для рускіх», які прадугледжвае ўсе правы для рускай нацыянальнасці, а ўсе абавязкі – для «іншародцаў». Рэалізацыя гэтага лозунга, як лічыў С. А. Ваньковіч, у тым ліку і праз урадавы законапраект аб земствах, пагражае эканамічным і палітычным аслабленнем Расійскай імперыі [29, с. 221].

Адмоўнае стаўленне да законапраекта прадэманстравалі кадэты. Член фракцыі кадэтаў у Думе, прафесар І. Ф. Лучыцкі (Кіеў) звярнуў увагу на тое, што «ў паўночна-заходнім і паўднёва-заходнім краі існуе славянскае племя, якое мае сваё нацыянальнае аблічча, якое паспела стварыць сваю культуру і сваю літаратуру». Дэпутат звяртаецца да ўлады з пытаннем: «Чаму ж урад адмаўляе ў земстве літоўцам, украінцам, беларусам?» [3, стб. 1028, 1034, 1038]. Кадэты лічылі, што ўвядзенне нацыянальных курый – паказчык грубейшай нацыяналістычнай палітыкі царызму, якая аслабляе дзяржаву на заходніх ускраінах.

Рэзалюцыю, якая адхіляла законапраект, прынялі трудавікі. Яны лічылі, што мясцовае самакіраванне павінна быць пабудавана «на роўным удзеле ў ім усяго мясцовага насельніцтва, без адрознення полу, рэлігіі і нацыянальнасці» [3, стб. 1229]. Дэпутат А. А. Булат, трудавік, лічыў, што дзейнасць урада накіравана на ўзбуджэнне нянавісці сялян да польскіх памешчыкаў, у той

час як у гаспадарчых пытаннях і польскія, і рускія памешчыкі будуць дзейнічаць у земствах заадно. А. А. Булат прызнаў законапраект «адным з найгоршых», паколькі ён «прасякнуты духам нацыянальнай нецярпімасці» і накіраваны не толькі на абмежаванне палякаў, «а яшчэ ў большай ступені пазбаўляе ўсялякіх правоў на самакіраванне ўсё мясцовае сялянскае насельніцтва, былі б гэта беларусы, украінцы, латышы або яўрэі, якіх нават да скрынь выбаршчыкаў не дапусцяць» [3, стб. 857].

Правыя партыі падтрымалі ідэалогію праекта, але лічылі недастатковымі антыпольскія меры. Манархічныя выданні друкавалі матэрыялы, накіраваныя супраць «іншародцаў», «польскага засілля» і «нацыянальнага сепаратызму» ў краі. Артыкулы выходзілі пад назвамі: «Задачы рускага нацыяналізму ў нашым краі», «Беларускі сепаратызм», «Расія для рускіх», «Новы паход на Беларусь» і інш. [1; 14; 27].

Сваё стаўленне да законапраекта выказвала «Наша ніва». У земскім самакіраванні, адзначала газета, найлепш было б, каб «мужыкі мелі найбольш галасоў і сілы», і толькі тады яны «змогуць выбраць у земства і з рускіх, і з палякаў, і з сваіх беларусоў добрых людзей» [12].

Законапраект быў прыняты Думай з нязначнымі папраўкамі. Але Дзяржаўны Савет 4 сакавіка 1911 г. большасцю галасоў адхіліў артыкул аб нацыянальных курыях. П. А. Сталыпін у такой сітуацыі перайшоў да рашучых дзеянняў. Пад пагрозай адстаўкі яму ўдалося дабіцца роспуску Дзяржаўнага савета і Дзяржаўнай думы на тры дні (з12 па 15 сакавіка 1911 г.) з тым, каб правесці законапраект аб заходнім земстве на падставе 87-га артыкула Асноўных дзяржаўных законаў Расійскай імперыі ад 23 красавіка 1906 г. у думскай рэдакцыі, што і было зроблена.

Указам ад 14 сакавіка 1911 г. на шэсць заходніх губерняў (Мінская, Віцебская, Магілёўская, Валынская, Кіеўская, Падольская), а не на дзевяць, як гэта меркавалася ўрадавым законапраектам, было распаўсюджана дзеянне «Палажэння аб земскіх установах 1890 г.» з уключэннем у яго змяненняў і дапаўненняў. Гэта значыць, што выбарныя земствы ўводзіліся толькі ў тых губернях, дзе з 1903 г. дзейнічалі спрошчаныя земскія ўстановы.

У параўнанні з цэнтральнымі губернямі Расіі асноўнае новаўвядзенне заключалася ў паніжэнні напалову маёмаснага цэнзу для атрымання права ўдзелу ў выбарах земскіх галосных. Такім чынам, выбаршчыкамі павятовых земскіх галосных станавіліся не толькі буйныя, але і сярэднія ўласнікі [25, с. 252].

Такі ж прэцэдэнт, як і падчас правядзення законапраекта аб заходнім земстве, у хуткім часе быў выкарыстаны дэпутатамі ад манархічных партый і ў адносінах да гарадскога самакіравання ў заходніх губернях. 30 лістапада 1911 г. 52 члены Думы выступілі з заканадаўчай прапановай аб дапаўненні некаторых артыкулаў Гарадавога палажэння 1892 г. у адносінах гарадоў васьмі заходніх губерняў: Віленскай, Віцебскай, Кіеўскай, Ковенскай, Мінскай, Магілёўскай і Падольскай.

Правыя лічылі, што сярод тых, хто прымае ўдзел у выбарах, домаўладальнікаў, гандляроў і прамыслоўцаў, пераважаюць палякі і яўрэі. Паколькі апошнія згодна з палажэннем 1892 г. не дапускаліся да самакіравання, «гаспадарамі становішча ў гарадах спрадвечна рускага Заходняга краю фактычна сталі палякі». Гэта супярэчыць, адзначалася далей, інтарэсам рускага насельніцтва і рускай дзяржаўнасці. Аўтары заявы пісалі: «Так як рускае гарадское насельніцтва ў Заходнім краі належыць да дзяржаўнага ў Імперыі рускага народа, то яно павінна мець прывілеі перад палякамі і астатнімі іншародцамі ў складзе прадстаўніцтва ў гарадскім самакіраванні» [22, л. 2–6, 9]. Яны прапаноўвалі падзяліць выбарчыя сходы на дзве групы: адна для рускіх гараджан, другая – для ўсіх астатніх.

Заява была перададзена ў камісію па гарадскіх справах, якая абмеркавала запыт 17 лютага 1912 г. Камісія падтрымала прапанову аб падзеле выбаршчыкаў па нацыянальных курыях пасля правядзення спецыяльнага даследавання. Толькі ў сувязі з заканчэннем паўнамоцтваў Думы рэалізаваць ініцыятывы дэпутатаў манархічнага кірунку не ўдалося [22, л. 13–14, 2].

Этнаканфесійныя праблемы ў Думе разглядаліся таксама пры абмеркаванні ўрадавай праграмы школьнай рэформы (законаў аб увядзенні ўсеагульнай пачатковай адукацыі, аб пачатковых вучылішчах, аб вышэйшых пачатковых вучылішчах, аб прыватных навучальных установах).

10 лістапада 1907 г. адбыліся выбары членаў камісіі па народнай адукацыі. У яе абавязкі ўваходзіла распрацоўка і першапачатковае абмеркаванне законапраектаў прадстаўнікамі роз-

ных партый. Камісія таксама збірала ўсе сведчанні, якія датычыліся ўнесенага законапраекта, прадстаўляла на агульны сход даклад яго тэксту і свае заключэнні да яго. У камісіі, як і ў самой Думе, ні адна з партый не мела вызначальнай большасці, але колькасную перавагу мелі члены Саюза 17 кастрычніка. Склад камісіі рабіў непазбежным сутычкі і саперніцтва ў ёй. Пры камісіі было створана 6 падкамісій па ўсіх галінах школьнай справы, у тым ліку і па праблемах «школ у мясцовасцях з нярускім насельніцтвам» [20, л. 1].

Вострыя дыскусіі ў III Думе выклікала пытанне аб навучанні на роднай мове. Дэпутат ад Польска-літоўска-беларускай групы К. Завіша ў выступленні 14 сакавіка 1908 г. адзначыў, што палажэнні Указа ад 1 мая 1905 г., якія датычаць ужывання роднай мовы, не выконваюцца. Між тым, на яго думку, сістэма адукацыі павінна ўлічваць як індывідуальныя, так і этнічныя асаблівасці вучняў. Дэпутат, у прыватнасці, прапанаваў дазволіць выкладанне на роднай мове ў прыватных пачатковых вучылішчах [29, с. 222–223].

Супрацьлеглую пазіцыю займалі правыя дэпутаты. Кіраўнік Заходне-рускага аб'яднання Д. Н. Чыхачоў ад імя Рускай нацыянальнай фракцыі заявіў аб «даволі нездавальняючай пастаноўцы выкладання рускай мовы і ў карэннай Расіі і на ўскраінах» і паставіў пытанне аб рэлігійна-эстэтычным выхаванні [4, с. 28, 29].

«Адзінства рускай дзяржаўнай мовы, выкладанне ва ўсіх урадавых, грамадскіх і прыватных школах выключна на рускай мове» – такой была платформа Віленскага «Рускага нацыянальнага саюза» [26].

Манархічны друк, выступаючы ад імя беларускага народа, імкнуўся запэўніць насельніцтва, што «ніякай патрэбы ў асаблівай літаратурнай мове для беларусаў німа, зыходзячы з гэтага ніякія кнігі на беларускай мове не патрэбны» [16].

Газета «Окраины России» пасля з'яўлення кніг на беларускай мове пісала, што «існуе дзве разнавіднасці рускай мовы: літаратурная і простанародная. Да апошняй належыць і беларуская мова. Аднак мовай адукаваных людзей і мовай кніг, – запэўнівала газета – можа быць толькі літаратурная (руская) мова» [15].

Такую ж пазіцыю займаў часопіс «Крестьянин»: «навошта выдумляць сваю мясцовую мову, калі існуе стройная сістэма рускай мовы» [7]. Манархічныя выданні, такім чынам, не прызнавалі факта існавання беларускай мовы.

«Наша ніва» ў сваіх публікацыях паслядоўна выступала за стварэнне беларускай народнай школы, гэтаму нават была прысвечана аднайменная рубрыка. Першачарговай мэтай было ўвядзенне беларускай мовы ў школе. Галоўную ролю ў гэтай справе газета адводзіла беларускай інтэлігенцыі. Выданне таксама абгрунтоўвала неабходнасць адкрыцця ВНУ ў Вільні [11].

29 сакавіка 1908 г. 37 дэпутатаў Думы, галоўным чынам кадэты, прадставілі праект асноўных палажэнняў аб мове выкладання ў пачатковых школах у заходніх губернях. У тлумачальнай запісцы аўтары праекта, на прыкладзе губерняў з маларускім насельніцтвам, адзначылі, што калі колькасць пісьменнага насельніцтва ў велікарускіх губернях дасягае 36%, то ў маларускіх – толькі 9 %. Дэпутаты лічылі, што «галоўнай прычынай такой сітуацыі з'явілася адарванасць тут школ ад народа». Падкрэслівалася, «што адукацыя насельніцтва не на той мове, на якой яно размаўляе і думае, не можа быць эфектыўнай» [21, л. 3, 9]. Аўтары законапраекта прапаноўвалі ўвесці выкладанне на роднай мове з 1908/09 навучальнага года пры абавязковым вывучэнні рускай мовы як дзяржаўнай. 26 мая 1909 г. запыт аб праекце быў перададзены ў камісію па народнай адукацыі [21, л. 1, 2].

У кастрычніку 1910 г. дакладчык ад камісіі па народнай адукацыі па пытанні ўвядзення ўсеагульнага пачатковага навучання акцябрыст В. К. фон Анрэп заявіў, што пасля спрэчак камісія прыйшла да высновы, што выкладанне павінна весціся на рускай мове, аднак у першыя два гады дазвалялася выкладанне на роднай мове навучэнцаў, з умовай, што і руская мова павінна выкладацца з першых трох месяцаў навучання [4, с. 11].

Падчас абмеркавання праекта закона свае пазіцыі выказалі дэпутаты ад нацыянальных ускраін. Епіскап Мітрафан, рэктар Магілёўскай духоўнай семінарыі, выступіў супраць праекта камісіі і запатрабаваў павышэння ролі праваслаўнай царквы ў адукацыі. Яго падтрымаў епіскап Яўлогій, дэпутат ад рускага насельніцтва Люблінскай і Сядлецкай губерняў [4, с. 54, 59, 68–71].

У падтрымку царкоўна-прыходскіх школ выступілі інспектар народных вучылішч Гродзенскай губерні В. К. Тычынін і правыя сяляне-ўкраінцы В. К. Пахальчак, дэпутат ад Падольскай губерні і М. С. Андрэйчук (Валынская губерня) [4, с. 96, 97, 221].

У сваю чаргу дэпутаты ад Польска-літоўска-беларускай групы крытыкавалі царкоўна-прыходскія школы, якія, на іх думку, праследавалі русіфікацыйныя мэты.

К. Завіша, адхіляючы абвінавачванні рускіх чарнасоценцаў у праследаванні палякамі літоўскай мовы ў Ковенскай губерні, звярнуў увагу на русіфікацыйную палітыку ўрада і адзначыў, што трэба весці гаворку не толькі пра літоўцаў: «Маларосы, беларусы і літоўцы маюць аднолькавыя правы вучыцца і размаўляць на сваёй роднай мове» [29, с. 223]. Вядома, што царскі ўрад прадугледжваў для беларусаў і ўкраінцаў толькі рускую мову навучання.

Крытычна выказаўся ў адносінах да праекта і літоўскі дэпутат А. А. Булат: «Расія з яе дзясяткамі народнасцей, хіба яна можа быць кіруема ў такой агульнай справе толькі з цэнтра» [4, с. 40].

Асаблівасці яўрэйскага культурнага развіцця і імкненне яўрэяў да адукацыі ахарактарызаваў дэпутат ад Ковенскай губерні, адвакат Н. М. Фрыдман. У якасці абмежавання магчымасцей для гэтага ён вылучыў наступнае: недапушчэнне выкладання нерэлігійных прадметаў і рускай мовы ў яўрэйскіх пачатковых школах, недастатковую колькасць вучылішч, якія фінансуюцца абшчынамі, абмежаванні ў прыёме яўрэяў у рускія навучальныя ўстановы. Як вядома, яшчэ ў 1887 г. для яўрэйскіх дзяцей была ўведзена працэнтная норма ў навучальных установах. Спасылаючыся на адсутнасць у спісе моў, якія дазволены да выкладання ў першыя два гады, яўрэйскай мовы, Н. М. Фрыдман заўважыў, што гэта «дае нам права патрабаваць школу на сваёй роднай мове» [4, с. 202–203].

Камісія па народнай адукацыі падрыхтавала запыт да старшыні Савета міністраў і міністра народнай адукацыі па прычыне выдання 11 сакавіка 1911 года палажэння аб устанаўленні нормы для яўрэяў пры допуску іх да здачы экзаменаў у сярэднія навучальныя ўстановы. Аднак даклад камісіі па гэтым запыце так і не быў разгледжаны [23, л. 11–12].

Акцябрысты, разлічваючы на прыцягненне да сябе сімпатый дэпутатаў ад нацыянальных рэгіёнаў, унеслі ў законапраект кампрамісную папраўку, згодна з якой у мясцовасцях, дзе пражываюць «палякі, літоўцы, немцы, татары, эстонцы, латышы, армяне, чэхі і грузіны, дазваляецца стварэнне аднакласных пачатковых вучылішч з прыроднай мовай выкладання», калі ў радыусе трох вёрст (або ў межах гарадскога пасялення) налічваецца не менш пяцідзесяці дзяцей школьнага ўзросту, якія не размаўляюць па-руску. Такім чынам, у акцябрысцкі спіс народаў, дзеці якіх маглі вучыцца ў першым класе на роднай мове, увайшло толькі дзевяць нацыянальнасцей. Беларуская мова, як бачым, у гэты спіс не ўвайшла.

Дэпутат ад Падольскай губерні, свяшчэннік, прагрэсіст М. І. Сяндэрка заўважыў, што Саюз 17 кастрычніка не адзначыў у сваім спісе ўкраінскай мовы. У камісіі па народнай адукацыі яе (як і беларускую) разглядалі як дыялект [4, с. 477–478].

Прадстаўнік Польска-літоўска-беларускай групы, дэпутат ад Віленскай губерні С. Г. Мацэевіч унёс на разгляд Думы дэпутацкі запыт да ўрада адносна цыркуляра інспектара народных вучылішчаў Дзісненскага павета. Цыркуляр абавязваў кіраўнікоў вучылішчаў назіраць, каб выкладанне Закона Божага для дзяцей-каталікоў адбывалася на рускай мове. Гэта было прамым парушэннем Указа ад 17 красавіка 1905 г., які дазваляў выкладанне на роднай мове вучняў. Прычым родная мова паводле Часовых правілаў міністэрства народнай асветы ад 22 лютага 1906 г. вызначалася заявамі бацькоў або апекуноў. Запыт быў прыняты нязначнай большасцю галасоў [29, с. 224]. У палітычную барацьбу адразу ж уключыліся прадстаўнікі галоўных манархічных партый А. Кавалюк, А. Вруцэвіч, Л. Саланевіч і іншыя, каб непасрэдна паўплываць на лёс дэпутацкага запыту. У выніку думскае абмеркаванне скончылася безвынікова. Апошняе слова засталося за чыноўнікамі, якія знайшлі сродак, каб абысці згаданы Указ. 27 кастрычніка 1912 г. з'явіўся цыркуляр міністра народнай асветы, у якім уводзіўся новы парадак вызначэння роднай мовы. Цяпер гэта павінны былі рабіць кіраўнікі навучальных устаноў «на падставе ўсіх фактычных даных, якія меліся па гэтаму прадмету» [32, с. 96]. Паступова былі адменены ўсе законы 1905–1906 гг., якія дапускалі родную мову ў навучальныя ўстановы.

Адначасова дэпутаты крытыкавалі рэлігійную адукацыю у «іншародных» школах і выступілі за роўнасць рэлігійных адукацыйных праграм. Акцябрысты выступалі за перадачу школьнай

справы міністэрству народнай асветы, адабраўшы гэтыя функцыі ў Сінода. Лібералы ў Думе прапаноўвалі поўнасцю перадаць школьную справу органам мясцовага самакіравання. Аднак быў прыняты акцябрысцкі варыянт.

Супраць «ідэй нацыяналізму, якія праводзіліся большасцю дэпутатаў Думы ў школьнай справе», выступалі сацыял-дэмакраты. Яны адстойвалі ўсеагульную бясплатную абавязковую свецкую адукацыю на роднай мове з забеспячэннем вучняў адзеннем, ежай і жыллём, свабодай грамадскай і прыватнай ініцыятывы ў галіне адукацыі.

Фракцыі кадэтаў, прагрэсістаў і трудавікоў падкрэслівалі, што ў школах сярод «іншародцаў» і на ўскраінах працягваецца палітыка русіфікацыі, «у выніку чаго па-ранейшаму ігнаруюцца ўвогуле бытавыя, этнаграфічныя і рэлігійныя асаблівасці іншароднага насельніцтва» [2, стб. 2700].

Праекты законаў «Аб увядзенні ўсеагульнай пачатковай адукацыі ў Расійскай імперыі» і «Аб пачатковых вучылішчах» з папраўкамі і дапаўненнямі былі прыняты Думай, аднак праз Дзяржаўны савет прайшоў толькі другі законапраект. У маі 1912 г. Дзяржаўны савет прыняў папраўку, якую ўнёс заснавальнік Ковенскага сельскагаспадарчага таварыства, член Савета паляк А. Мэйштовіч; яна дазваляла выкладанне Закона Божага для дзяцей «маларосаў і беларусаў – на рускай мове, для літоўцаў – на літоўскай, а для палякаў – на польскай» [29, с. 232]. Як бачым, прадстаўнікі ад Польшчы ў Дзяржаўным савеце не ўлічвалі ў сваёй дзейнасці факта існавання беларускай і ўкраінскай моў.

Вялікую ролю ў сістэме нацыянальных адносін адыгрывала канфесійная палітыка ўрада Расійскай імперыі. У III Дзяржаўную думу Міністэрствам унутраных спраў было накіравана шэраг законапраектаў па пытаннях рэлігіі. У іх ліку былі наступныя: аб змяненні законапалажэнняў, якія датычыліся пераходу з аднаго веравызнання ў іншае; аб адмене ў дзеючым заканадаўстве абмежаванняў, як палітычных, так і грамадзянскіх, якія знаходзіліся ў залежнасці ад прыналежнасці да «іншародных» і «іншаверных» веравызнанняў; аб рымска-каталіцкіх касцёлах; аб адносінах дзяржавы да асобных веравызнанняў.

Яшчэ на пачатку дзейнасці III Думы была створана камісія па справах веравызнання. Першапачаткова старшынёй камісіі падчас 1-й сесіі быў выбраны люблінскі епіскап Яўлогій, затым яго змяніў юрыст, член фракцыі акцябрыстаў П. В. Каменскі, які ўзначальваў камісію да канца працы III Думы. Па свайму складу дадзеная камісія практычна поўнасцю адлюстроўвала расклад дэпутацкага корпуса Думы ў цэлым: па рэлігійнай прыналежнасці дамінавалі праваслаўныя дэпутаты (21 чалавек з 35), а па партыйных поглядах – акцябрысты (21 чалавек), нацыяналісты (9 чалавек) і правыя (5 чалавек). Дастаткова высокай была доля асоб, якія мелі духоўныя званні – 15 чалавек, у тым ліку праваслаўных святароў – 13, мусульманскіх і каталіцкіх – па 1 дэпутату.

Магчыма, такі склад камісіі вызначаў ход абмеркавання прапанаваных законапраектаў і характар прымаемых рашэнняў. Нават дэпутаты-святары, па заяве епіскапа Яўлогія, былі «абавязаны ў сваёй парламецкай дзейнасці лічыцца з сінодскімі пастановамі», у той час як Сінод зразумела выказаўся наконт міністэрскіх законапраектаў, знаходзячы іх «неадпавядаючымі інтарэсам пануючай царквы» [2, стб. 1753–1756]. Ідэолаг правых Л. А. Ціхаміраў, са старонак «Московских ведомостей», увогуле прапаноўваў адазваць усе міністэрскія законапраекты з Думы і адкласці іх да Царкоўнага сабору, «а ў чаканні – усе, праваслаўныя і іншаверцы, змогуць як-небудзь пацярпець пры часовых правілах» [30, с. 172]:

Адным з найбольш важных для прадстаўнікоў усіх канфесій быў законапраект «Аб змяненні законапалажэнняў, якія датычыліся пераходу з аднаго веравызнання ў іншае». Менавіта ён, найбольш падрабязна і з удзелам П. А. Сталыпіна абмяркоўваўся ў III Думе ў маі-чэрвені і ў канцы кастрычніка 1909 г.

Даклад па законапраекту быў прадстаўлены агульнаму сходу Думы старшынёй камісіі П. В. Каменскім 22 мая 1909 г. Члены камісіі 18 галасамі супраць 10 прадставілі права пераходу «кожнай асобе, якая дасягнула 21-гадовага ўзросту, ва ўсякае веравызнанне і веравучэнне, прыналежнасць да якога не праследуецца ў крымінальным парадку». Нязгодная з такім палажэннем меншасць камісіі настойвала на тым, што «непатрэбна ўсе рэлігіі прызнаваць роўнымі і неабходна аддаць перавагу хрысціянскай рэлігіі, якая з'яўляецца падмуркам дзяржавы». Пазіцыю крайне правых па гэтым пытанні найбольш поўна можна ўявіць з выступлення Н. Е. Маркава,

дэпутата ад фракцыі правых. Ідэю раўнапраўя «незалежна ад рэлігіі, незалежна ад племя» ён назваў амаральнай і запытаўся: «Калі роўныя правы будуць нададзены ўсім грамадзянам рускай дзяржавы … то ў чым жа тут справядлівасць?» [2, стб. 1949].

З рэзкай крытыкай наконт магчымага раўнапраўя веравызнанняў выступіў таксама прэм'ер-міністр П. А. Сталыпін. Ён нагадаў асноўнае ў нацыянальным пытанні палажэнне Маніфеста ад 3 чэрвеня 1907 г., што Дума «павінна быць рускай па духу, у якой іншыя народнасці павінны мець прадстаўнікоў сваіх патрэб, але не ў колькасці, што зробіць іх вырашальнікамі спраў выключна рускіх». На яго думку, закон не будзе прыняты народам, і «нанясе вялікую шкоду народнай душы і жыццёвым асновам рускай дзяржавы» [2, стб. 1758, 1764].

Пры абмеркаванні законапраекта такія ж думкі выказвалі епіскапы Яўлогій і Мітрафан. Апошні падкрэсліў, што законапраект павінен стаяць на абароне «правоў аднаго праваслаўя як рэлігіі, якая з'яўляецца пануючай у Расіі» [2, стб. 1766, 1786].

Супрацьлеглую пазіцыю па гэтым пытанні займалі прадстаўнікі іншых думскіх фракцый. Кадэт В. А. Маклакоў ахарактарызаваў адносіны ўрада да гэтага праекта як «поўную рашучасць прызнаць прынцып на словах і такую ж поўную рашучасць адмовіцца ад яго на справе» [2, стб. 1785, 1786]. І. І. Гайдараў, сацыял-дэмакрат, дакладна вызначыў гэты прынцып: «Свабода сумлення – гэта азначае права чалавека распараджацца сваім унутраным, духоўным жыццём, права яго верыць або не верыць, права яго ствараць самакіруючыя рэлігійныя суполкі». Ён, таксама нагадаў, што амаль палову насельніцтва Расійскай імперыі складаюць «іншародцы» і «іншаверцы» [2, стб. 2019, 2020].

Член Польскага кола А. І. Парчэўскі звярнуў увагу на праследаванні ўніятаў і каталікоў, ён падтрымаў развіццё прынцыпаў свабоды сумлення і пажадаў, каб у Расіі «дзяржава зусім не клапацілася справамі веры і пытанні аб прыналежнасці да таго ці іншага веравызнання надавала б кожнаму асобнаму грамадзяніну» [2, стб. 1881].

Закон аб пераходзе з аднаго веравызнання ў іншае быў прыняты Думай па дакладу рэдакцыйнай камісіі 30 кастрычніка 1909 г. Аднак найбольш значнай перашкодай на шляху пераўтварэння праекта ў закон стаў Дзяржаўны савет, які больш за два гады трымаў яго сярод сваіх папер і прыступіў да яго абмеркавання толькі ў лістападзе 1911 г. У выніку Дзяржаўны савет адхіліў усе змяненні, унесеныя Думай, і запатрабаваў захавання міністэрскага варыянта законапраекта.

Праекты аб адмене абмежаванняў для прадстаўнікоў «іншародных» і «іншаверных» веравызнанняў, аб каталіцкіх касцёлах, аб дазволе богаслужэнняў для «іншаверцаў» і іншыя разгледжаны не былі.

Пытанні рэлігійнай палітыкі не раз уздымаліся ў нумарах «Нашай нівы». Асабліва турбавала газету праблема канфесійнага падзелу беларусаў. Такі падзел, як лічыла выданне, уплывае на нацыянальную свядомасць беларусаў, дзеліць яго на «рускіх» і «палякаў». Газета выступала за ўвядзенне беларускай мовы ў касцёльнае і царкоўнае набажэнства [31, с. 58].

Такім чынам, «Наша ніва», уступаючы ў палеміку з рускімі і польскімі выданнямі, займала нязменную пазіцыю і даказвала, што беларуская мова і беларускі народ аб'ектыўна існуюць, і з гэтым трэба лічыцца. Аналізуючы дзейнасць III Думы, трэба адзначыць, што яна не спраўдзіла тых спадзяванняў, якія на яе ўскладаліся. Выканаўчыя і заканадаўчыя (па большасці прадстаўленых у ёй партый) галіны ўлады адрозніваліся кансерватызмам і адлюстроўвалі імперскае бачанне нацыянальнага пытання. Гэта праявілася ў ігнараванні дзяржавай інтарэсаў развіцця адукацыі і асветы, навучання на роднай мове шырокіх нацыянальных груп насельніцтва, ігнараванні патрэб прадстаўнікоў іншых рэлігійных канфесій, заканадаўчыя замацаванні прывілеяванага становішча рускіх прадстаўнікоў маёмасных класаў у органах мясцовага кіравання і самакіравання.

Літаратура

1. Белорусская жизнь. – 1909. – 9 февр.
2. Государственная дума. Третий созыв. Стенографические отчеты. Сессия II. – СПб., 1909. – Ч. 4.
3. Государственная дума. Третий созыв. Стенографические отчеты. Сессия III. – СПб., 1910. – Ч. 4.
4. Государственная дума. Третий созыв. Стенографические отчеты. Сессия IV. – СПб.: прил. к газете «Россия». – 1910. – Ч. 1.

5. З а б а ў с к і, М. М. Расійская Дзяржаўная дума ў лёсах Беларусі (1906–1917 гг.). / М. М. Забаўскі. – Мінск: БДПУ, 2008. – 267 с.
6. К о з л я к о в, В. Е. Национальный вопрос и неонароднические партии. Начало XX в. – конец 20-х гг. (На материалах России, Беларуси, Украины) / В. Е. Козляков. – Минск: БГТУ, 2001. – 247 с.
7. Крестьянин. – 1909. – 4 июня.
8. Минское слово. – 1912. – 29 марта.
9. Националисты в 3-й Государственной думе. – СПб., 1912.
10. Наша ніва. – 1906. – 10 ліст.
11. Наша ніва. – 1908. – 25 крас.
12. Наша ніва. – 1908. – 22 мая.
13. Обзор деятельности Государственной думы третьего созыва. 1907–1912 гг. – СПб., 1912. – Ч. 2.
14. Окраины России. – 1908. – 29 марта.
15. Окраины России. – 1908. – 19–26 июля.
16. Окраины России. – 1908. – 22 нояб.
17. Окраины России. – 1910. – 15 мая.
18. Окраины России. – 1911. – 28 мая.
19. О л ь д е н б у р г, С. С. Царствование императора Николая II / С. С. Ольденбург. – М., 1992.
20. РДГА. – Фонд 278. – Воп. 1. – Спр. 231.
21. РДГА. – Фонд 1278. – Воп. 2. – Спр. 2307.
22. РДГА. – Фонд 1278. – Воп. 2. – Спр. 2436.
23. РДГА. – Фонд 1278. – Воп. 2. – Спр. 2470.
24. С а м б у к, С. М. Общественно-политическая мысль Белоруссии во второй половине XIX в. / С. М. Самбук. – Минск, 1976.
25. Свод законов Российской империи: в 5 кн. – СПб., 1912. – Кн. 1. – Т. 2.
26. Северо-Западная жизнь. – 1912. – 11 марта.
27. Северо-Западная жизнь. – 1912. – 2 авг.
28. С л а б а ж а н і н, В. П. Да гісторыі ўвядзення земства ў Беларусі (1864–1911 гг.) / В. П. Слабажанін // Весці АН БССР. Сер. грамад. навук. – 1983. – № 4. – С. 73–80.
29. С м а л я н ч у к, А. Ф. Паміж краёвасцю і нацыянальнай ідэяй. Польскі рух на беларускіх і літоўскіх землях. 1864 – люты 1917 г./ А. Ф. Смалянчук. – СПб.: Неўскі прасцяг, 2004. – 406 с.
30. Т и х о м и р о в, Л. К реформе обновленной России (Статьи 1909, 1910, 1911 гг.) / Л. К. Тихомиров. – М., 1912.
31. У н у ч а к, А. У. «Наша ніва» і беларускі нацыянальны рух (1906–1915 гг.) / А. У. Унучак. – Мінск: Беларус. навука, 2008. – 186 с.
32. Ч и х а ч е в, Д. К вопросу о располячении костела в прошлом и настоящем/ Д. Чихачев. – СПб., 1913.

P. A. TRUBCHYK

NATIONAL PROBLEMS IN THE POLITICAL LIFE OF BELARUS DURING THE 1907–1912 YEARS

Summary

Activities of the Third State Duma on national question have been elucidated in the article. Views of political parties, groups and publication in the press on national question of Belarus in 1905-1907 years have been analyzed by the author, too.